УРАДЖАЙ ЗАЎТРАШНІ – КЛОПАТ СЁННЯШНІ

# Хлебаробы нарошчваюць тэмпы

**Асаблівая ўвага вяскоўцаў зараз прыкавана да палёў, дзе разгортваюцца масавыя работы. Набірае абароты пасяўная кампанія і ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Рачэнь».**

«Сёлетняя вясна няпростая для хлебаробаў. Уласна кажучы, да нядаўняга часу надвор'е не дазваляла ў поўную моц весці ўвесь спектр палявых спраў. А зараз пачалася сапраўдная барацьба за час, бо ён ідзе, а ўчасткі дагэтуль стаяць незасеянымі, – распавёў галоўны аграном «Рачэні» Аляксандр Кійко. – Але, упэўнены, з задачай мы справімся. Тэхніка падрыхтавана належным чынам, людзі накіраваны на добрасумленную працу».

Што да задачы, то мясцовым рупліўцам трэба загарнуць збожжавыя і зернебабовыя на плошчы 750 га: па 100 – ячменю, аўса, гароху, пшаніцы і 350 га трыцікале. Кожны ўчастак папярэдне рыхтуецца ў адпаведнасці з агратэхнічнымі патрабаваннямі, у асноўную запраўку пад поўную патрэбу ўносяцца мінеральныя тукі. Гэтым займаюцца спрактыкаваныя вяскоўцы. Як і непасрэдна на сяўбе. Мікалаю Янушу не так шмат роўных знойдзецца ў дадзенай справе. За некалькі дзесяцігоддзяў ён набыў такі вопыт, што, можна сказаць, з закрытымі вачамі здольны загортваць зярняты ў глебу, прычым якасна. Штодзённая выпрацоўка сейбіта на Фэндзе ў счэпе з дыскавым комплексам Pronto 8 SW Horsch, які эксплуатуе толькі другі сезон, складае 40–50 гектараў. Не падводзяць і вадзіцель Сяргей Кукраш, што своечасова дастаўляе на поле насенны матэрыял, палявод Надзея Каток, якая ажыццяўляе засыпку яго. Такой зладжанай камандай і шчыруюць вяскоўцы, закладваючы трывалую аснову будучага ўраджаю. У першую чаргу пасеялі авёс гатунку «лідзія», затым – трыцікале «ўзор».



**Трактарыст-машыніст Мікалай ЯНУШ – сапраўдны майстар хлебнай нівы.**

Што, канешне, важна, у гаспадарцы паклапаціліся пра сортаабнаўленне і сортазамену. Набыта па адной тоне гадавальніка размнажэння аўса, ячменю, пшаніцы, а таксама па 10 т суперэліты. Такім чынам сфарміраваны добры насенны фонд, які зараз выкарыстоўваецца з гаспадарскім падыходам.

Шчыруюць рачэнскія майстры хлебнай нівы. Яны разумеюць, што кожная хвілінка цяпер – на вагу золата, і зямля-карміцелька шчодра адорыць толькі самых дбайных і старанных.

**Наталля ВІЛЕНТА.**
**Фота аўтара.**

## На парадку дня – сяўба

У земляробаў пачалася гарачая пара.

З рання і да змяркання яны ўвіхаюцца на палетках, бо прамаруджваць нельга – трэба справіцца ў аптымальныя тэрміны.

А згодна з дадзенымі райсельгасхарчу, на Любаншчыне раннія яравыя неабходна загарнуць на 6 444 гектарах, што больш як на 2 тыс. га перавышае леташнюю плошчу.

Трэць ад запланаванага ўжо выканана. У лідарах – забалацкія хлебаробы, якія пасеялі звыш 80 працэнтаў збожжавых і зернебабовых. Яны маюць, да слова, і найбольш высокую дзённую выпрацоўку – у сярэднім каля 100 га.

Што да культур, то найбольш увогуле па раёне загорнута зярнят аўса – больш чым на 900 га – і ячменю – амаль на 700 га. Вядзецца таксама сяўба пшаніцы, трыцікале, аднагадовай групы раслін і інш.

АПК

# Каб забяспечыць зялёны канвеер

**Сярод вясновых палявых работ не апошняе месца адводзіцца падсеву шматгадовых траў.**

Каб пасля можна было забяспечыць так званы зялёны канвеер і стварыць трывалую кармавую базу для грамадскага статка на зімова-стойлавы перыяд.

Найбольш актыўна дадзенай справай займаюцца ў СУ «Загальскі» і ААТ «Юрковічы». У першай гаспадарцы шматгодка (злакавыя і канюшына луговая) – падсеяна на плошчы каля 120 гектараў, а ў другой (бабова-злакавыя травы) – звыш 130 га. Акрамя таго, пачата перазалужэнне пашаў і сенажацяў шматкампанентнымі сумесямі, якія пры правільным доглядзе з'яўляюцца высокапрадукцыйнымі, дазваляюць у летні пашавы перыяд павялічваць надоі.



**Ні хвіліны не губляе Іван ЧАЙКОЎСКІ, працуе дбайна нават у непагоду.**

У прыватнасці, у «Юрковічах» падсеў ажыццяўляе адзін з вопытных механізатараў гаспадаркі Іван Чайкоўскі. За яго плячыма ўжо не два і нават не тры дзясяткі адказных сельгаскампаній. Вопыту і майстэрства хапае ў земляроба, і давераную справу ён выконвае якасна, акуратна, па-гаспадарску.

НОВОЕ В ЗАКОНОДАТЕЛЬСТВЕ

# Хозяевам усадеб нужно подтвердить деятельность

**В последние годы в нашей стране большое внимание уделяется развитию региональной инициативы и конкретных территорий, поддержке субъектов агроэкотуризма, которые в свою очередь содействуют сохранению и приумножению наших национальных культурных традиций, воспитанию бережного отношения к природе.**

На совершенствование регулирования деятельности в данной сфере, повышение качества оказываемых услуг направлен указ Президента Республики Беларусь от 4 октября 2022 г. №351 «О развитии агроэкотуризма». В силу нормативный документ вступил с 1 января нынешнего года. В соответствии с пунктом 13 указа субъект агроэкотуризма, который был зарегистрирован до 1 января 2023-го, обязан до 1 июля текущего года получить решение районного исполнительного комитета об осуществлении деятельности по оказанию услуг в сфере агроэкотуризма. Что необходимо для этого? Хозяевам нужно обратиться с заявлением установленного образца и согласием собственника (собственников) жилого дома на использование его (для осуществления деятельности по оказанию услуг в сфере агроэкотуризма) в службу «одно окно» райисполкома. В течение 30 календарных дней рассматриваются предоставленные заявителем документы, заключение комиссии по комплексной объектовой оценке агроэкоусадеб и принимается соответствующее решение (либо дается отказ). Порядок осуществления административной процедуры определен Постановлением Совета Министров от 9 декабря 2022 г. №860 «О реализации указа Президента Республики Беларусь от 4 октября 2022 г. №351».

К слову, на территории Любанского района функционируют две агроэкоусадьбы: «Золотая пчела», расположенная в деревне Хотиново, и «На ростанях» в городском поселке Уречье. Каждая из них привлекает клиентов своими «изюминками».

## К сведению

**Служба «одно окно» райисполкома работает в понедельник, вторник, четверг, пятницу с 8.00 до 17.30, в среду с 8.00 до 20.00, в 1, 3 и 5-ю субботу с 9.00 до 13.00. Телефоны для справок: 8 (01794) 64-5-04, 68-5-99. Единый справочно-информационный номер телефона для оказания консультативной помощи по осуществлению административных процедур 142.**